Мая Радзіма – Беларусь

Цыбулька Ганна Паўлаўна, 5 "Б" клас,
ДУА "Сярэдняя школа №3 г. Ганцавічы"

Гэту гісторыю нам расказала наша настаўніца беларускай мовы і літаратуры…

Аднойчы хлопчык-пяцікласнік Міхаська Міцкевіч разам з бацькамі паехаў адпачываць у Егіпет. Малы вельмі часта хварэў, і дактары параілі звазіць яго ў якую-небудзь ў цёплую краіну.

Спачатку Міхаська вельмі абрадаваўся, бо марыў пабачыць свет, але, калі даведаўся, што падарожжа выпадае на зіму, трохі засмуціўся. Бацькі дзівіліся, аднак не распытвалі: здароўе сына на першым месцы. А справа была ў тым, што Міхаську вельмі не хацеў прапускаць школу, асабліва ўрокі беларускай літаратуры, дзе якраз чыталі Якуба Коласа. Вельмі ж любіў хлопчык гэтага пісьменніка. Але нічога не зробіш, трэба ехаць.

Вось ужо і Егіпет. Нязвыкла было малому з халоднай зімы праз некалькі гадзін апынуцца ў спякотным леце. Усё яго дзівіла: і вялізныя піраміды, і бясконцыя пустыні, дзе няма і кавалачка зялёнай зямлі, і трошкі страшныя вярблюды, і салёнае мора, і гэты дзіўны няспынны рух і шум, якога няма нават у Мінску.

Аднаго разу Міхаська з бацькамі чакалі ў гатэлі, калі ж спадзе спякота, каб можна было схадзіць на пляж. У суседніх нумарах таксама жылі сем'і з дзецьмі. Міхась, дарэчы, з імі ўжо паспеў пазнаёміцца. І вось малыя сабраліся разам. Гэта былі дзеці з Чэхіі, Швейцарыі, Румыніі, Аўстрыі і Германіі. Зразумела, што паміж сабой яны гаварылі па-англійску. Кожны расказваў пра сваю краіну, выхваляўся, як у іх добра і прыгожа. Адзін Міхаська сціпла сядзеў і слухаў. Ён шмат чаго ведаў пра гэтыя краіны і марыў у іх пабываць. І вось адзін хлопчык папрасіў Міхаську расказаць пра яго Радзіму, бо ён ніколі нават не чуй пра яе.

Міхась пасядзеў трошкі, падумаў і пачаў свой аповед:

– Мая Радзіма – Беларусь! Гэтая невялічкая краіна ў форме кляновага лісточка, якая знаходзіцца ў самым цэнтры Еўропы. У нас вы не пабачыце ні бяскрайняга мора, ні высозных гор, ні пустыні, ні джунгляў. Але нашы краявіды ўсё роўна самыя неверагодныя. Празрыстыя блакітныя азёры і рэкі чаргуюцца з зялёнымі лясамі і бяскрайнімі палямі. У вёсках хаты ўпрыгожваюць буслянкі з буслямі, а ў гарадах заўсёды ёсць зялёныя паркі, дзе можна адпачыць.

Увогуле ў нас няма вечнага тлуму, як, напрыклад, у Егіпце. Нават у Мінску, сталіцы Беларусі, вы не сустрэнеце такога руху і шуму. У гарадах і вёсках вельмі чыста, пра гэта клапоцяцца самі жыхары.

У Беларусі няма мора. Але ці бачылі вы наша возера Нарач? Яно ж амаль як акіян! Бясконца спакойнае, прыгожае і неверагоднае. А колькі легенд існуе пра яго?! Сама атмасфера гэтага возера прымушае фантазаваць, уяўляць, як некалі яго абступалі непралазныя лясы і пушчы. Нарач яшчэ называюць беларускім морам, але вада ў ім нашмат больш празрыстая і

чыстая. На гэтым возеры вы ніколі не пабачыце штормаў з высознымі хвалямі, возера толькі зменіць свой колер на цямнейшы, нібы папярэджваючы пра небяспеку.

А колькі ўсяго можна наведаць у Беларусі! Гэта Мірскі і Нясвіжскі замкі, Белавежская пушча, Сафійскі сабор, касцёл у Гервятах, Брэсцкая крэпасць. Так можна пералічваць да бясконцасці. Але, ведаеце, нават ехаць асабліва не трэба, бо самая маленькая вёсачка можна расказаць і паказаць безліч чаго, галоўнае толькі ўважліва прыгледзецца.

Наш народ вельмі шануе гісторыю сваё краіны. Але беларус ніколі не будзе на ўвесь свет выхваляцца сваімі здабыткамі і дасягненнямі. Яму дастаткова ўнутранага гонару за сваю краіну. Наш народ увогуле вельмі памяркоўны, талерантны, цярплівы і трошкі сціплы. Мы заўсёды рады гасцям, калі тыя прыходзяць з дабром. Калі хтосьці з вас вырашыць наведаць Беларусь, то сустрэне ветлівы прыём, дапамогу і шмат усмешак.

Міхаська скончыў свой аповед і абвёў вачыма дзяцей. Тыя навыперадкі сталі задаваць пытанні пра невядомую ім, але такую цікавую краіну, а хтосьці нават папрасіў Міхася сказаць што-небудзь на роднай мове.

Вечарам хлопчык абдумваў гэты дзень і так моцна захацелася яму дадому, на родную Беларусь. Добра, што адпачынак закачваецца пра два дні…

Настаўніца скончыла расказваць гэту гісторыю. Наш клас доўгі час сядзеў моўчкі. Здаецца, усе думалі пра адно. Кожны з нас марыў пабываць ў іншых краінах. Але да гэтага мы, мабыць, і не задумваліся, што нас таксама акаляе вельмі шмат цікавага і непаўторнага, таго, што больш нідзе не сустрэнеш. Перш, чым пачаць падарожнічаць, трэба даведацца ўсё пра сваю маленькую радзіму і краіну.

Я ўпэўнена, што Радзіма ў чалавека адна. Іншай ужо не будзе. Менавіта тут, у Беларусі, жывуць нашы бацькі, тут мы праводзім дзяцінства, расцём і становімся сапраўднымі грамадзянамі.

Мы яшчэ, як і Міхаська, усяго пяцікласнікі, але толькі ад нас залежыць будучае нашай краіны. Мы з’яўляемся працягам сваіх бацькоў і настаўнікаў. Мы будзем тымі, хто будзе ствараць новыя дасягненні і праслаўляць сваю радзіму. І, хто ведае, можа праз час які-небудзь Міхаська і пра нас будзе з гонарам расказваць дзецям з іншых краін…